 Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2012-08-10

# Патрыярх беларускасці



**Чалавек-энцыклапедыя ды чалавек-аркестр, патрыярх сярод даследчыкаў — толькі малая частка эпітэтаў, якімі яго ўзнагароджвалі. Афіцыйна — Адам Мальдзіс, доктар філалагічных навук, прафесар, стваральнік навукова-асветніцкага цэнтра імя Ф. Скарыны, ганаровы старшыня Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, супрацоўнік колішняга Інстытута літаратуры Акадэміі навук, старшыня камісіі "Вяртанне" Беларускага фонду культуры, выдатны этнограф... І гэта зноў жа толькі невялікая частка.**

**Алеся БАЦЮСЬ,**
**фота Кастуся Дробава**

Адаму Мальдзісу 7 жніўня споўнілася 80. Адметна, што шматлікія госці, якія прыйшлі павіншаваць Адама Восіпавіча, сустракалі юбіляра гучнымі апладысментамі і стоячы — з павагай, з захапленнем яго працай, зробленым і ўведзеным упершыню. Гэтае словазлучэнне найбольш часта сустракаецца, калі гавораць пра яго ўнёсак: ён адкрыў, вярнуў і ўвёў у навуковы ўжытак шэраг імёнаў і твораў беларускай культуры. Гэта ён цягам гадоў акрэслівае месца беларусаў у еўрапейскім і сусветным кантэксце, даследуе сувязі нашага народа з польскім, літоўскім ды адначасова паказвае нам нашу багатую спадчыну. Чаго толькі варты даведнік "Беларусы і ўраджэнцы Беларусі ў памежных краінах", які расказвае амаль пра шэсцьсот выбітных асоб. І гэта праца не скончана. Так, пры Інстытуце культуры Беларусі рыхтуецца яшчэ адно выданне такога кшталту — даведнік "Сузор'е блізкага памежжа. Беларусы, народжаныя ў суседніх краінах", якое раскажа пра паўтары сотні нашых выбітных суайчыннікаў, што жывуць у іншых краінах — Літве, Расіі, Казахстане...

Не менш цікавымі і значнымі падаюцца выданні пра У. Караткевіча, жыццё нашых продкаў у XVIII стагоддзі, беларускія скарбы за мяжой (а іх, як сцвярджае А. Мальдзіс, раскідана па іншых краінах каля 90 працэнтаў).

Зрэшты, юбілейная вечарына больш нагадвала жыццяпіс — аповед самога А. Мальдзіса, успаміны пра юбіляра яго землякоў, аднакурснікаў, сяброў, калег. І так эпізод за эпізодам у цэльную карціну жыцця ўпісваліся асобныя аповеды, што сведчылі і пра непаўторнае пачуццё гумару навукоўцы, і надзвычай высокую працаздольнасць, і пра вялікі талент. Зрэшты, партрэт атрымаўся па-сяброўску цёплым.

Прыемна, што гэты заняты чалавек, у якога і сёння шмат спраў і задумак, знаходзіць час пісаць і дасылаць свае артыкулы і нам. Вось і сёння "ЛіМ" з гонарам можа прапанаваць чытачам цікавы матэрыял пра Маю Львовіч. І яго варта пачытаць, бо подпіс "Адам Мальдзіс" — гэта знак якасці!